Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Бывалыя агароднікі вядуць нататнікі, дзе адзначаюць любімыя сарты, малююць схему ўчастка з указаннем культур, якія раслі на тых ці іншых градках. Часу гэта займае няшмат, а карысць велізарная. Бо дакладная схема дазваляе скласці ідэальны план пасадак з улікам севазвароту.**

# ПЛАНУЕМ ГРАДКІ ПА ПРАВІЛАХ

Галоўнае правіла — расліны не варта вырошчваць на адным месцы больш за два гады запар, а лепш мяняць культуры на градках кожны год. Больш за тое, мяняць трэба не толькі культуры, але і сямействы, да якіх яны адносяцца. Напрыклад, бульба і тамат адносяцца да сямейства паслёнавых, і таму на наступны год пасля бульбы нельга вырошчваць памідоры. Ці пасля капусты нельга вырошчваць радыску, а пасля морквы — пятрушку.

У раслін аднаго сямейства агульныя хваробы і шкоднікі, яны назапашваюцца ў глебе, і ўраджайнасць рэзка зніжаецца.

Падобныя культуры выносяць з грунту адны і тыя ж элементы сілкавання.

Некалькі зглядзіць усе гэтыя негатыўныя з'явы дапамагае ўнясенне арганічных угнаенняў, якія папаўняюць глебу пажыўнымі рэчывамі, аднак ніяк не знішчаюць інфекцыю і шкоднікаў. Таму выконваць севазварот ці хоць бы пладазмен трэба! Гэта датычыцца і вялікіх палёў, і маленькіх градак.

Выключэннем з гэтага правіла служаць бульба і кукуруза, якія можна вырошчваць на адным месцы некалькі гадоў запар, пры гэтым не назіраецца рэзкага зніжэння ўраджайнасці і іншых негатыўных з'яў. Але гэта не значыць, што бульбу можна

> **ПАМЯТКА. Прыналежнасць раслін да сямействаў**
>
> ***Астравыя*** — салата, артышок, эстрагон, салатны цыкорый, сланечнік.
> ***Бабовыя*** — бабы, віка, гарох, лубін, соя, фасоля, сачавіца.
> ***Грэчкавыя*** — рэвень, шчаўе, грэчка.
> ***Капусныя*** — дайкон, усе віды капусты, крэс-салата, ліставая гарчыца, радыска, рэдзька, рэпа, хрэн, рукала.
> ***Цыбульныя*** — усе віды цыбулі, чарэмшына, часнок, ракамболь.
> ***Амарантавыя*** — буракі сталовыя, шпінат, мангольд.
> ***Паслёнавыя*** — баклажан, бульба, перац, тытунь, тамат, фізаліс.
> ***Сельдэрэйныя (парасонавыя)*** — аніс, кервель, каляндра, морква, пастарнак, пятрушка, сельдэрэй, кмен, кроп, фенхель.
> ***Гарбузовыя*** — кавун, дыня, кабачок, агурок, патысон, гарбуз, лагенарыя, маmордзіка.
> ***Ясноткавыя*** — базілік, ісоп, маяран, меліса, мята перачная, чабор.

вырошчваць на адным участку дзесяць гадоў запар.

Даваць «адпачываць» зямлі трэба і ад бульбы.

Пры размяшчэнні гароднiны на градках варта ўлічваць і наяўнасць шматгадовых раслін. Напрыклад, паблізу ад хрэну нельга высейваць насенне іншых прадстаўнікоў сямейства капусных, бо ранняй вясной на ім з'яўляецца капусная блыха, якая з радасцю перакінецца і на іншыя расліны.

Пры распрацоўцы севазвароту трэба ўлічваць, што большасць шкодных мікробаў захоўваюць сваю жыццяздольнасць у глебе не больш за пяць гадоў, і калі вы вытрымаеце гэты тэрмін, то яны загінуць ад бяскорміцы. На аснове гэтай асабліваці распрацавана сістэма чатырох квадратаў, якая прадугледжвае вяртанне раслін на ранейшае месца праз чатыры гады. Такім чынам, напрыклад, можна цалкам пазбавіцца ад кілы капусты. Пасля выяўлення хваробы на градцы нельга вырошчваць не толькі капусту, але і іншых прадстаўнікоў сямейства крыжакветных на працягу чатырох гадоў. Калі ў перыяд такога каранціну пасееце там, напрыклад, рукалу, то споры кілы ажывуць, і тэрмін каранціну трэба будзе адлічваць ізноў.

Каб спрасціць працэс севазвароту, можна ўзяць за правіла сартаваць усё насенне на чатыры групы: ліставыя, пладовыя, караняплоды і бабовыя. Агарод у думках дзелім на чатыры ўчасткі. На першым вырошчваем пладовыя. На другім — караняплоды, на трэцім — бабовыя, на чацвёртым — ліставыя. У наступным годзе зрушваем усе расліны на адну пазіцыю (пладовыя — на чацвёрты ўчастак, ліставыя — на трэці і г. д.). Такім чынам атрымліваецца лёгка выконваць севазварот. Культуры вяртаюцца на ранейшае месца толькі праз тры гады і не трэба складаных разлікаў і планавання.

Чаргаваць культуры на ўчастку трэба не толькі з улікам сямействаў, але і па патрабавальнасці да ўрадлівасці грунту.

«Аматараў смачна паесці» (крыжакветныя, гарбузовыя) вырошчваюць на самым урадлівым участку, куды восенню ўносяць максімум угнаенняў.

У наступным годзе на іх месцы (але ўжо без унясення арганікі) сеюць другую па патрабавальнасці да сілкавання групу — паслёнавыя.

На трэці год займаюць гэтыя градкі парасонавымі.

На чацвёрты год сеюць бабовыя, якія самі ўзбагачаюць глебу азотам і паляпшаюць яе структуру. Плюс восенню ўносяць на гэтыя градкі мінеральныя ўгнаенні і гной. А вясной ізноў высейваюць тут насенне першай групы раслін.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.55 | 17.52 | 8.57 |
| Віцебск — | 8.49 | 17.37 | 8.48 |
| Магілёў — | 8.45 | 17.42 | 8.57 |
| Гомель — | 8.36 | 17.44 | 9.08 |
| Гродна — | 9.10 | 18.08 | 8.58 |
| Брэст — | 9.05 | 18.14 | 9.09 |

### Месяц

*Першая квадра 28 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

*Пр.* *Рымы, Яфіма.*
*К.* СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЯЕ. *Марыі, Карнеля, Мірослава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 2 ЛЮТАГА

У краіне

**1348** год — адбылася бітва беларуска-літоўскіх войскаў з крыжакамі на рацэ Стрэве (прыток Нёмана каля Коўна). Маскоўскія летапісы, якія амаль зусім не звярталі ўвагі на барацьбу ВКЛ з крыжакамі, унеслі наступную вестку аб той бітве: «Бой был немцем с Литвою на Страве реце и побиша Литвы 40 000». Нямецкія храністы перабольшвалі яе маштаб, але, напэўна, паражэнне было вельмі цяжкім. Сярод загінулых названы Монтвід і Нарымонт, браты Альгерда. У гонар перамогі ў Кёнігсбергу ордэнам крыжаносцаў была пабудавана царква Дзевы Марыі (лічылася заступніцай ордэна). Між тым ордэн не змог скарыстацца вынікамі перамогі: у Еўропе бушавала эпідэмія чумы, людскія рэсурсы ордэна моцна зменшыліся, ціск крыжакоў на літоўскія заходнія і паўночна-заходнія граніцы ў наступныя гады няўхільна зніжаўся.



**1386** год — падчас агульнага з'езду шляхты ў Любліне вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Ягайла абраны каралём Польшчы пад імем Уладзіслава II.

**1536** год — нарадзіўся Пётр Скарга, пісьменнік, дзеяч Контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай, першы рэктар Віленскага ўніверсітэта. З 1588 года прыдворны прапаведнік караля Жыгімонта III Вазы, які цаніў яго за выдатны дар красамоўства. Стаў прыхільнікам абмежавання ўлады Сейма і пашырэння ўладных паўнамоцтваў караля, адным з ініцыятараў Брэсцкай царкоўнай уніі. Рэлігійны саюз зменшыць адасобленасць і варожасць паміж праваслаўнымі і каталікамі, стварыць умовы для развіцця навукі і народнай асветы і ўмацуе ўнутранае адзінства і палітычную магутнасць Рэчы Паспалітай.

**1938** год — нарадзілася (в. Астрашыцкі Гарадок) Таццяна Дзмітрыеўна Самусенка, беларуская спартсменка (фехтаванне на рапірах), заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі. Чэмпіёнка XVII, XIX і XX Алімпійскіх гульняў (1960, 1968, 1972), пяціразовая чэмпіёнка свету, шматразовая чэмпіёнка СССР. Неаднаразовая ўладальніца Кубка Еўропы, Кубка СССР.

***У гэты ж дзень*** нарадзіўся Уладзімір Феліксавіч Багінскі, беларускі вучоны ў галіне лесаводства, членкарэспандэнт НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па лесаводстве, лесаўпарадкаванні, лясной таксацыі, лесааднаўленні, эканоміцы і арганізацыі лясной гаспадаркі, экалогіі раслін.

У свеце

**1238** год — хан Батый разрабаваў і спаліў Маскву. Лаўрэнцеўскі летапіс, вядомы па спісе 1377 года, так апісаў спусташэнне горада: «Взяша Москву татарове, и воеводу убиша Филипа Нянка за правоверную хрестьянскую веру, а князя Володимера яша руками, сына Юрьева, а люди избиша от старьца и до сущаго младенца; а град и церкви святыя огневи предаша, и манастыри вси и села пожгоша и много именья вземше отъидоша».

**1886** год — у ЗША ўпершыню афіцыйна адсвяткавалі Дзень сурка.

**1918** год — СНК Савецкай Расіі зацвердзіў дэкрэт «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных таварыствах» (аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы).

**1943** год — савецкія войскі атрымалі гістарычную перамогу ў Сталінградскай бітве, якая ўнесла вырашальны ўклад у дасягненне карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне.

Так гаварыў...

**САКРАТ:**

*«Жэнішся ты ці не — усё роўна пашкадуеш».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Можа, возьмем што да чаю?

— А ты чаго хацела б?

— Ну не ведаю. Можа, піва возьмем?

— Давай, і скумбрыю вэнджаную.

**Выдавец — перакладчыку:**

**— Прабелы вы не перакладаеце, таму прабелы мы вам аплачваць не будзем.**

**— Добра, я дашлю вам пераклад без прабелаў.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.672. Індэкс 63850. Зак. № 409.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 лютага 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12